ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
8
САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 8 (1421)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### НА ПЛЕНУМЕ

студэнцкага прафкома старшынёй прафсаюзнага камітэта выбраны А. Д. Кішкевіч.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### НА МІЖНАРОДНЫМ ТУРНІРЫ

ў Швецыі ў саставе зборнай СССР выступаў Камандар Маджыдаў. Ён правёў восем паядынкаў і ва ўсіх перамог, выйграўшы ў мацнейшых барцоў свету.

В. РУДЗЯНКОЎ,
старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.

### У ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ

у Вярхоўны Савет СССР перад выбаршчыкамі з вялікай канцэртнай праграмай выступіла народная агітбрыгада універсітэта «Фенікс».

Э. АНІСЕНКА,
мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.

### ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

агляду-конкурсу «За культурны быт» сярод інтэрнатаў універсітэта за 1983 год. На першым месцы калектыў інтэрната № 1, які ўзнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам рэктарата, парткома, прафкома і камітэта камсамола, а таксама граматай і каштоўным падарункам. Другое і трэцяе месцы занялі адпаведна інтэрнаты № 5 і № 6.

П. ЛАПЦЁНАК,
намеснік старшыні прафкома.

### САВЕТ

універсітэта на чарговым пасяджэнні падвёў вынікі зімовай лабараторна-экзаменацыйнай сесіі 1983—1984 навучальнага года. З дакладам выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар Я. П. Пятраеў. Былі разгледжаны і некаторыя іншыя пытанні.

І. УЛАДЗІМІРАЎ.

### ФІНІШЫРАВАЛА ПЕРШЫНСТВО

ВНУ рэспублікі па лёгкай атлетыцы ў закрытых памяшканнях. Паспяхова выступіла лёгкаатлетычная зборная універсітэта і заняла першае месца.

А. БАЛДЗІН,
старшыня спартыўнага клуба.




## ЁЙ

В тебе, в тебе одной
природа, не искусство,
Ум обольстительный
с душевной простотой,
Веселость резвая
с мечтательной душой,
И в каждом слове мысль,
и в каждом взоре чувство!

Ёй, жанчыне, прысвячаюць паэты оды і санеты. Ёй — самыя ўзнёслыя сардэчныя словы адрасуюць празаікі. А ўкожным мужчыне жыве і паэт і празаік адначасова. Ёй абавязаны мы ўсім: жыццём, радасцю і смуткам, усмешкай сына і цудоўным імгненнем першага спаткання, ажыццёўленымі планамі і запаветнымі марамі... Ёй мы абавязаны і клопатамі перад... 8 Сакавіка. Прыемнымі клопатамі.

Дзе толькі ў гэтыя перадсвяточныя дні не сустрэнеш мужчын! І ў чарзе за малаком і смятанай у гастраноме, і ў ювелірным аддзеле магазіна «Сувеніры», і нават у заснежаным лесе — а раптам пашанцуе і знойдуцца падснежнікі. Мітусяцца мужчыны, з усіх сіл выбіваюцца, каб павіншаваць сваіх дарагіх жанчын неяк незвычайна. Наш фотакарэспандэнт выхапіў з гэтага перадсвяточнага жыцця толькі адзін момант — юнак з кветкамі, падарункамі рашуча накіроўваецца да сваёй адзінай...

А мы віншуем **усіх** жанчын з іх святам! Нахай **дзеля кожнай** будуць такія мужчынскія клопаты!

● МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ ●

## ПОЕЗД ДРУЖБЫ Ў МІНСКУ

МНЕ ПАШАНЦАВАЛА не адразу. Аказалася, што сярод такой колькасці прыбыўшых гасцей не так лёгка знайсці тых, хто можа размаўляць па-руску.

У гэтай групцы сініх рубашак дзяўчаты заўсміхаліся і дружна паказалі на высокага светлавалосага хлопца. Як высветлілася потым, яго веды па рускай мове таксама вельмі сціплыя. І ўсё ж Інгальф мне вельмі дапамог. Сам ён — студэнт-біёлаг Берлінскага універсітэта. У Савецкім Саюзе першы раз, і, зразумела, — мноства уражанняў.

— Мне вельмі спадабаліся Масква, Ленінград, — гаворыць Інгальф. — У Ленінградзе з сябрамі тры разы абышоў вакол плошчы Перамогі, каб, па павер'ю, вярнуцца сюды яшчэ. І я веру, што гэта адбудзецца.

Інгальф гаворыць, энергічна размахваючы рукамі, раз-пораз цікавячыся, ці разумею я. Размаўляем, стараючыся перакрычаць музыку, якая запоўніла ўсю залу: ідзе дыскатэка.

А Клаўдзія і Карола ўжо былі ў нашай краіне. Ім запомнілася больш за ўсё Чырвоная плошча. Цудоўныя ўражанні засталіся і пасля наведвання Эрмітажа. «Хаця, — пашкадавалі яны, — былі ў ім усяго тры гадзіны». Карола — медыцынская сястра для дзяцей, як яна сказала. Клаўдзія вучыцца ў тэхнікуме электра- і машынабудавання.

Так, у саставе поезда дружбы з ГДР у асноўным студэнты ВНУ і тэхнікумаў, ёсць маладыя спецыялісты. Для ўсіх іх паездка ў Савецкі Саюз — узнагарода за актыўную грамадскую і навуковую работу, выдатную вучобу. Поезд дружбы стаў ужо традыцыйнай формай супрацоўніцтва паміж студэнтамі дзвюх краін. На гэты раз універсітэт прымаў каля 400 гасцей.

Сустрэча нямецкіх гасцей са студэнтамі БДУ імя У. І. Леніна адбылася ў Доме культуры чыгуначнікаў. На вечары выступіў дэкан па рабоце з замежнымі навучэнцамі Л. М. Аўсянка. Ён расказаў аб сувязях БДУ імя У. І. Леніна з універсітэтамі Берліна, Іены, аб вучобе і адпачынку нямецкіх студэнтаў, што вучацца ў нашым універсітэце. Пажадаў, каб гэты сумесны вечар стаў сапраўдным святам дружбы і надоўга застаўся ў памяці гасцей.

Канцэрт пачаў фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш». Яркія нацыянальныя касцюмы, цудоўнае выкананне прымушалі прысутных уважліва сачыць за дзеяннем на сцэне. А тым былі... каляды. Так, вясёлае народнае свята. Аб тым, як яго святкуюць у Беларусі, хлопцы і дзяўчаты стараліся расказаць нямецкім сябрам з дапамогай песень, танцаў. І хаця госці, напэўна, не ведалі беларускай мовы, але яны разумелі і смутак дзяўчыны, разлучанай з каханым, і чула ўгадвалі народны гумар, і тады па радах прабягаў дружны смех.

У канцы сустрэчы нямецкія сябры перадалі савецкім студэнтам, якія любяць спяваць і смяяцца (гэты вывад яны зрабілі з уласнага вопыту) пажаданні здароўя, поспехаў, а ў першую чаргу — «фрыдэн», міру. А я ўспомніла, як прадстаўнік нямецкай дэлегацыі сказала ў сваім выступленні ў пачатку сустрэчы, што галоўная задача для ўсіх — захаванне міру. І выканаць яе можна толькі ўмацоўваючы дружбу і салідарнасць паміж народамі. Яна адзначыла, што пэўную ролю ў гэтай справе адыгрывае і такая форма інтэрнацыянальнай сувязі, як поезд дружбы. Пацвярджэннем гэтага быў сам вечар.

С. ВЯРОХА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

● РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!

# ПАТЭНЦЫЯЛ ІНСТЫТУТА

НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ інстытут прыкладных фізічных праблем БДУ імя У. І. Леніна дасягнуў дорых вынікаў у выкананні планавых заданняў трох гадоў XI пяцігодкі. Умацавалася матэрыяльна-тэхнічная база інстытута, узраслі доля важнейшай тэматыкі і ўзровень яе каардынацыі, умацаваліся сувязі інстытута з вытворчым і вучэбным працэсам, дасягнуты значныя поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных навуковых кадраў, у вынаходніцкай дзейнасці.

Усе дзяржбюджэтныя і 77 працэнтаў гаспадарча-дагаворных тэм навукова-даследчых работ інстытута аднесены да катэгорыі важнейшых. Удзельная вага НДР, выконваемых па пастановах дырэктыўных органаў, склала 71 працэнт (у 1982 годзе было 58 працэнтаў). У 1983 годзе аб'ём гаспадарча-дагаворных работ з прадпрыемствамі рэспублікі склаў 737 тысяч рублёў, што ў два разы больш, чым у 1982 годзе. З году ў год расшыраецца вынаходніцкая дзейнасць лабараторый інстытута. У 1983 годзе атрыманы 133 аўтарскія пасведчанні і станоўчыя рашэнні на вынаходніцтвы, пададзена 112 заявак.

У 1983 годзе інстытутам укаранёна ў народную гаспадарку 169 навуковых распрацовак, з іх 53 — у рэспубліцы. Гэта ў чатыры разы больш колькасці ўкаранёных распрацовак у першым годзе XI пяцігодкі. Штогодні эканамічны эфект ад укаранення распрацовак за апошнія чатыры гады складае 7,5—8 млн. рублёў. Шырокая і наменклатура навуковай прадукцыі інстытута: новыя прылады, матэрыялы, тэхналогія, алгарытмічныя і праграмныя сродкі. Да найбольш буйных работ інстытута толькі за апошнія 5 гадоў можна аднесці: распрацоўка 32 тыпаў прылад, 13 тэхналагічных працэсаў і 29 новых матэрыялаў для электроннай, аптычнай, радыётэхнічнай і будаўнічай прамысловасці. Для розных прамысловых арганізацый распрацавана 12 комплексаў праграмных сродкаў.

Распрацоўкі прылад у асноўным заканчваюцца стварэннем і ўкараненнем эксперыментальных узораў вырабаў, шэсць з іх тыражыраваны малой серыяй. Знайшлі выкарыстанне ў серыйнай вытворчасці 8 з 13 распрацаваных супрацоўнікамі інстытута тэхналагічных працэсаў і 3 матэрыялы з 29 створаных. 45 працэнтаў пералічаных работ укаранёны ў межах рэспублікі.

Нягледзячы на станоўчыя вынікі работы, асноўныя формы ўкаранення рэзультатаў навукова-даследчых работ у народную гаспадарку патрабуюць удасканалення. Галоўная задача ў тым, каб у поўнай меры выкарыстоўваць навуковы патэнцыял інстытута ў розных галінах ведаў з канчатковым вынікам у выглядзе серыйных вырабаў.



Распрацоўка ў інстытуце новых прылад, матэрыялаў і тэхналагічных працэсаў атрымала высокую ацэнку на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР. За 1972—1983 гг. інстытутам атрымана 1 залатая, 6 сярэбраных 12 бронзавых медалёў.

За дасягнутыя вынікі ў сацыялістычным спаборніцтве НДІ ПФП уручаны пераходны Чырвоны сцяг Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў. Сцяг уручыў сакратар ЦК галіновага прафсаюза В. М. Бярэзін.

На ўрачыстым сходзе выступілі рэктар БДУ імя У. І. Леніна акадэмік АН БССР **Л. І. Кісялеўскі**, дырэктар НДІ ПФП **А. Ф. Чарняўскі**, загадчык аддзела спектраскапіі і люмінесцэнцыі **Д. С. Умрэйка**, мантажніца радыёапаратуры **Г. М. Сакалова**, вядучы інжынер, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР **В. М. Баранчыкаў**, старшыня прафбюро **Б. П. Усцінаў**.

**С. ЦЫБУЛЬНІК.**

**НА ЗДЫМКУ: уручэнне ганаровай узнагароды.**

● СВЕТ ВАШЫХ ЗАХАПЛЕННЯЎ ●

# ЛЮБІМЫ ЖАНР — ФАНТАСТЫКА

У НАШ КАСМІЧНЫ век многія людзі, асабліва моладзь, захапляюцца навуковай фантастыкай. Як правіла, гэта граматныя, эрудзіраваныя чытачы, якія добра разумеюць сучаснае і хвалююцца за лёс будучага. Адметнай рысай аматараў навуковай фантастыкі з'яўляецца імкненне да зносін з аднадумцамі. Ім хочацца разам абмеркаваць творы, якія спадабаліся, паспрачацца аб праблемах і г. д. Задачам аб'яднання служаць клубы аматараў фантастыкі, якія створаны і ствараюцца ў многіх гарадах нашай краіны.

У студзені 1983 года па ініцыятыве Маскоўскага раённага аддзялення Усесаюзнага таварыства кнігалюбаў г. Мінска быў створаны клуб аматараў фантастыкі «Зорны шлях». Ён мае статус раённага, прымае ў свае рады ўсіх жадаючых, незалежна ад месца жыхарства і роду заняткаў. Клуб аматараў фантастыкі мае свой статут, заснаваны на статуце Усесаюзнага таварыства кнігалюбаў. Дэвіз нашага клуба: «Мара — заўтрашняя рэальнасць».

Асноўнай формай работы клуба з'яўляецца адкрытая дыскусія: абмяркоўваем творы, якія хвалююць многіх, знаёмімся з навінкамі, разглядаем творы розных аўтараў, звязаныя адной ідэйнай асновай. Праходзіць гэта звычайна так: нехта з членаў клуба вывучае матэрыялы па той ці іншай тэме і робіць для ўсіх агляд. Пасля гэтага пачынаецца абмеркаванне, дзе звычайна выказвае сваю думку кожны. Такім чынам выяўляюцца праблемы і тэмы навукова-фантастычных твораў, якія хвалююць усіх, і таму кожнаму хочацца падзяліцца з сябрамі сваімі меркаваннямі.

Усяго клуб правёў 12 пасяджэнняў, прысвечаных розным тэмам. Сярод іх: «Творчасць А. і Б. Стругацкіх», «Творчасць А. і Ф. Абрамавых», «Фантастыка часопіса «Уральский следопыт», «Хімічная тэматыка ў навуковай фантастыцы» і іншыя.

Пры клубе арганізавана і літаратурная секцыя для тых, хто сам спрабуе пісаць у гэтым жанры. Літсекцыя збіраецца асобна, але ўсе яе члены прыходзяць і на сумесныя сходы клуба. Членам літаратурнай секцыі можа стаць кожны, хто жадае паспрабаваць сябе ў творчасці. Творы пачынаючых фантастаў абмяркоўваюцца на пасяджэннях літсекцыі. А тыя з іх, якія атрымліваюць станоўчую адзнаку, пасылаюцца ў рэдакцыі газет для апублікавання. Так што, калі ёсць жаданне — прыходзьце, калі ласка!

«Зорны шлях» падтрымлівае кантакты з іншымі клубамі нашай краіны і за мяжой. Мы пішам адзін аднаму аб сваіх справах, клопатах, праблемах, дзелімся ўражаннямі і вопытам. Ідзе таксама абмен творамі навуковай фантастыкі, узятымі з «партфеля» літсекцыі.

У красавіку гэтага года ў Мінску будзе праводзіцца навукова-метадычная канферэнцыя на тэму: «Навуковая фантастыка і навукова-тэхнічная рэвалюцыя». Канферэнцыя арганізуецца нашым клубам сумесна з Маскоўскім раённым аддзяленнем Усесаюзнага таварыства кнігалюбаў і гарадскім клубам аматараў фантастыкі «Цыялкоўскі». На канферэнцыю запрошаны пісьменнікі-фантасты і прадстаўнікі клубаў аматараў фантастыкі з іншых гарадоў краіны.

**Г. ШЫШКО,**
**намеснік старшыні клуба аматараў фантастыкі «Зорны шлях».**

● ...І ПЯЦЬ СТУДЭНЦКІХ ГАДОЎ ●





# КУЛЬМІНАЦЫЯ!

— МОЖНА? Дзяўчына набліжаецца да размеркавальнай камісіі.

— Сядайце, калі ласка! — ветліва сустракаюць яе мужчынскія галасы.

Вось і ўсё. Прамільгнулі пяць студэнцкіх гадоў, і нават не верыцца, што сёння ў многім вырашаецца твой лёс. Размеркаванне... Перад ім — хваляванне, крышачку нават баязлівасць, пасля — задавальненне, радасць, зрэдку — засмучэнне.

— Сёлета размеркаванне нашых пяцікурснікаў прайшло вельмі паспяхова, — гаворыць намеснік дэкана філалагічнага факультэта Мікалай Міхайлавіч Піпчанка. — Амаль усе студэнты задаволены сваімі будучымі месцамі работы. З 87 чалавек 22 накіраваны ў Мінскі гарана, 5 — у Бабруйскі, па 2 — у Аршанскі і Мазырскі, па 1 — у Баранавіцкі і Полацкі. Астатнія — у Мінскі, Гродзенскі, Брэсцкі і Гомельскі аблана.

**НА ЗДЫМКАХ: ідзе размеркаванне; уважліва, чула адносіцца да кожнага студэнта старшы інспектар аддзела кадраў Міністэрства асветы БССР У. І. Васілеўскі; вось і вырашаны лёс Жанны Радкевіч.**

Фота **С. Плыткевіча.**



● ІСЦІНА Ў НЕ АПОШНЯЙ ІНСТАНЦЫІ ●

# МУЖЧЫНЫ ПРА ЖАНЧЫН...

**Пра жанчын гавораць мужчыны. Можа гавораць не зусім сур'ёзна, з гумарам але не абавязкова пагаджацца з гэтымі выказваннямі, тым больш, што адзін з іх папярэджвае: «Мастацтва быць мудрым заключаецца ва ўменні ведаць, на што не патрэбна звяртаць увагі».**

## ...ГАВАРЫЛІ ЎЧОРА:

**«Жанчыны — лепшыя выхавацельніцы роду чалавечага».** Гіпель (Германія, 18 стагоддзе).

**«Пра ўзрост жанчыны і музыкі ніколі не трэба гаварыць».** Голдсміт (Англія, 18 стагоддзе).

**«У некаторых выпадках адна жанчына намнога больш пранікнёная, чым сотня мужчын».** Лесінг (Германія, 18 стагоддзе).

**«Самая моцная вада ў свеце — жаночыя слёзы».** Джон Марлі (Анлія, 18—19 стагоддзі).

**«Тое, што мы называем інтуіцыяй жанчыны, часта тлумачыцца проста празрыстасцю намераў мужчыны».** Натан (ЗША, 20 стагоддзе).

**«Нас рэдка прывязвае да жанчыны тое, чым яна нас прываблівае».** Колінз. (Англія, 18—19 стагоддзі).

**«Ці ведаеце вы, якая вялікая жаночая цікаўнасць! Амаль такая, як і мужчынская».** Уайлд (Англія, 19 стагоддзе).

**«Жанчыну нельга абяззброіць кампліментам, мужчыну можна заўсёды».** Уайлд (Англія, 19 стагоддзе).

**«Тайны двара часта схаваны ў складках жаночых спадніц».** Шыллер (Германія, 18—19 стагоддзі).

**«Будучае жанчыны не ў яе маці»** Бернард Шоу (Англія, 19—20 стагоддзі).

## ...ГАВОРАЦЬ СЁННЯ:

А вось што гавораць пра жанчын мужчыны нашага універсітэта, адказваючы на пытанні анкеты.

**1. Ці лічыце Вы, што жанчына — самая цудоўная палова чалавецтва?**

**2. Што Вы больш за ўсё цэніце ў жанчыне?**

**3. Ці ёсць у Вас літаратурная гераіня, якая адпавядала б Вашаму ідэалу жанчыны?**

**4. «Я помню чудное мгновенье:**
**Передо мной явилась ты,**
**Как мимолетное виденье,**
**Как гений чистой красоты».**
**Ці было ў Вас такое імгненне?**

**5. Як бы аднесліся Вы да вяртання матрыярхату?**

**6. Ваша ўяўленне аб сучаснай жанчыне?**

**П. І. ТКАЧОЎ, прафесар:**

1. Лічу, калі не лічыць, што побач жыве другая цудоўная палова чалавецтва — мужчыны.
2. Жанчыну.
3. Такі ідэал жанчыны мастакі слова яшчэ не стварылі.
4. Спадзяюся, што ў мае пяцьдзесят з гакам гадоў усё яшчэ наперадзе.
5. Ад дабра дабра не шукаюць.
6. Гл. адказ на пытанне № 3.

**Мікалай СОБАЛЬ, студэнт чацвёртага курса механіка-матэматычнага факультэта, жанаты:**

1. Калі лічыць, што палова, тады цудоўная.
2. Прыгажосць, розум, згаворлівасць з мужам.
3. Я. Булавіна з трылогіі «Блуканне па пакутах». Шчыра спадзяюся, што наступным у гэтым спісе будзе імя маёй жонкі...
4. Было. Пасля чаго я жаніўся.
5. Ніяк. Гэта нерэальна.
6. Станоўчае.

**Вадзім ГРАМОВІЧ, студэнт факультэта журналістыкі, халасты:**

1. Аксіёмы не аспрэчваюць.
2. Жаноцкасць.
3. Пільна сачу за навінкамі літаратуры. Пакуль безвынікова.
4. Яно яшчэ працягваецца.
5. Назад дарогі няма.
6. !!!

● ПЯШЧОТНАМУ ЛЕТУ НАЎЗДАГОН ●

# ЗА «ДЗЯКУЙ»!

СБА — справа не для дзяўчат. Дзе-нідзе і сёння даводзіцца чуць варыяцыі гэтай, кажу з упэўненасцю, застарэлай думкі. Камуністычны СБА «Маладосць» — грунтоўнае пацвярджэнне на карысць тых, хто прытрымліваецца супрацьлеглага цунку гледжання.

Педатрад «Маладосць» працаваў мінулым летам у Мінскім дзіцячым доме. Разумею, што слова «працаваў» не раскрывае ўсяго сэнсу таго, што зрабілі дзяўчаты. Дабрату сваіх сэрцаў, пяшчоту і ласку яны дарылі маленькім хлапчукам і дзяўчынкам.

Пры словах «студэнцкі будаўнічы атрад» звычайна ўяўляецца самая рамантычная атрыбутыка: палаткі, вогнішчы, навальніцы і пякучая гарачыня, усе наяўныя і ўяўныя цяжкасці, безумоўна, з іх пераадоленнем. Аднак цяжкасці таксама — розныя.

Успамінае камісар педатрада Галіна Краўчанка:

— Калі мы трапілі сюды ўпершыню, то нам здалося, што не справімся. Маці і з двума-трыма дзецьмі цяжка справіцца, а тут па дваццаць пяць малых у кожнай групе. І кожны—асоба!

Да кожнага патрабаваўся свой падыход: каб падбадзёрыць засмучанага, супыніць свавольніка, аб'яднаць усіх агульнай добрай і неабходнай справай. Адным словам, педагогіка.

— Рознае здаралася, — працягвае Галіна, — і кухталямі адзін аднаго частавалі, і есці адмаўляліся, і не заўсёды слухаліся... Аднаго толькі не было — ніколі не ўцякалі. А да нас у дзіцячым доме здаралася, што дзеці ўцякалі.

— Самыя шчаслівыя хвіліны? — былы камісар на момант задумалася. — Той час, калі дзяцей укладваеш спаць. Праспяваеш калыханку, і яны, паслухмяныя такія, ужо пасапваюць бесклапотна. Але было і так: «Нават казка спаць кладзецца...» — і раптам плач. З аднаго ложка, з другога, трэцяга... І вось ужо плачуць амаль усе. «Мамка, мама, вазьмі мяне да сябе!» І не ведаеш, што рабіць, да каго першага падысці, чым супакоіць.

— Чаму мы яшчэ навучыліся там, у дзіцячым доме? Любіць сваю маці. Вось што такое атрад «Маладосць»... Наша работа.

На памяць прыходзяць радкі з даўно прачытанай кнігі: «ніякі духоўны рух у абстракцыі ўзнікнуць не можа, бо ён вынік агульнай грамадскай справы».

Хвалявалася дырэктар дзіцячага дома А. П. Кацянова, выступаючы на абласным злёце камуністычных атрадаў:

— Вялікае вам дзякуй, дарагія мае дзяўчаты! Прыходзьце да нас — заўсёды будзем вам рады. І памятайце: на свеце растуць дзеці, якія называлі вас мамамі. Самым узнёслым імем жанчыны.

У чым жа сутнасць дзейнасці такіх камуністычных атрадаў, як «Маладосць»? Іх яшчэ называюць атрадамі бязвыплатнай працы. Магчыма, іменна ад недакладнасці гэтай назвы і атрымаўся пэўны недавер, нотка непаразумення ў адносінах да гэтых атрадаў. Чаму гэта, маўляў, пры нашым агульным прынцыпе аплаты за працу нехта раптам вырашае працаваць за «проста так»? Такія пытанні таксама ставіліся ў свой час. Прычым сур'ёзна, з акрэсленай «лагічнай начынкай». І атрымлівалася, быццам практыка трапіла ў супрацьлегласць логіцы... Але так толькі здавалася. Байцы камуністычных атрадаў не згодны працаваць выключна за «проста так». Прынцып аплаты па працы яны адмяняць зусім не збіраюцца. Проста грошы, якія яны атрымліваюць, зарабляюцца імі з пэўнай мэтай. Купіць дзіцячаму дому аўтобус. Або каляровы тэлевізар. Або спартыўнае абсталяванне. Канкрэтныя рэчы за канкрэтныя грошы, канкрэтным хлопчыкам і дзяўчынкам. Так што ўся іх дзейнасць скіравана вельмі далёка ад паняццяў абстрактнага дабра і поўнай безадплатнасці. Проста «адплату» за сваю працу кожны чалавек мае права атрымліваць у той форме, якая яго больш задаволіць. І акрэсліваецца, што вельмі многіх задавальняе іменна такая форма, прынятая ў камуністычных атрадах.

— І гэта так цудоўна, — зазначыла ў канцы размовы Галіна Краўчанка, — што ў гэтым годзе ў БДУ будзе створана не два, не тры, а сем такіх атрадаў. Гэта значыць, што малышы пачуюць новыя казкі, байкі і песні, часцей будуць усміхацца...

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
**наш кар.**

● ЛІРЫЧНА-ІРАНІЧНЫ ФОТАРЭПАРТАЖ ●





# НУ І ЖАНЧЫНЫ!..

ДАЎНО даказана: хата без жанчыны — гэта не хата, а месца, дзе мужчына сяк-так можа прабавіць свой час. Чаму? Таму што не будзе ў ёй ні дамашняй утульнасці, якая залежыць ад чыста жаночай расстаноўкі мэблі, ні прыгожых гардзін на вокнах, выбраць якія могуць толькі жанчыны, ні смачных абедаў, бо ніводнаму мужчыне не па сіле кулінарнае майстэрства.



Але вось каля пліты двое — ён і яна. Што гэта—эксперымент? Ці можа юнак пасягнуў на спрадвечна жаночую справу? Праслухаў тэарэтычны курс, а цяпер на першай вытворчай практыцы? Аб гэтым гаворыць і секундамер у руках дзяўчыны, і яе поза строгага экзаменатара. Дзе ж ёй яшчэ паказаць сваю сілу, здольнасці, калі не ў гэты момант! Вось і глядзіць яна так строга на свайго падапечнага.

А вось другі чыста жаночы позірк. Угледзьцеся—так і ззяе ў гэтых вачах гонар, упэўненасць. А што ж яшчэ можа свяціцца на твары жанчыны, калі за яе пяшчотную ручку нясмела трымаецца такі арол, гатовы ў любую мінуту хоць на край свету збегаць, каб толькі выканаць любое яе жаданне?

Жанчыны... Яны могуць усё: падымацца кожны дзень да ўзыходу сонца і класціся пазней за ўсіх, на цэлыя месяцы знікаць у тайзе ў геалагічных экспедыцыях, дрэйфаваць на льдзінах, смела ўваходзіць у клетку да драпежнага звера і рэгулярна ветліва сустракаць свайго мужа, які крышачку пазней звычайнага вярнуўся з работы.

Жанчыны... У цяжкія пасляваенныя гады яны на сабе аралі зямлю. Магчыма вось так, чалавек сем-восем цягнулі, плуг, як гэтыя дзяўчаты паднімаюць штангу. Тут што — смех ды і толькі, тады ж было не да смеху...

Кажуць, жанчыны намнога больш спагадлівыя, добразычлівыя, чым мужчыны. Яны першыя гатовы кінуцца на дапамогу, ніколі не пакінуць таварыша ў бядзе, асабліва калі таварыш — мужчына. Яны не толькі падаюць руку пацярпеўшаму, яны і рукзак яго возьмуць, калі ён ад стомы ледзь ногі перастаўляе. Не пакідаць жа чалавека!



Але ж уся бяда ў тым, што мы, мужчыны, пачынаем вельмі часта карыстацца іх дабратой. Ужо не супраць і лішняе узваліць на жаночыя плечы. Таму не лішнім будзе напомніць нашым дарагім мужчынам: беражыце сваю мужчынскую годнасць, не давайце падстаў для насмешак. А лепш за ўсё ўявіце жанчыну такой, якой уявіў яе чацвёртакурснік з біяфака Ігар Бышнеў.

**С. ПЛЫТКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

*Адміністрацыя Лірычна-Іранічнага ФакультэТа шчыра віншуе прыгожую палову сваіх чытачоў са святам!*

# СЮРПРЫЗ

Да мяне падышоў Барыс Сяргееў і сказаў:

— Давай рубель. Заўтра — 8 Сакавіка. Патрэбна адзінай нашай жанчыне, Алачцы, падарунак зрабіць.

Я дастаў дробязь. У мяне было толькі семдзесят капеек.

— Бора, трыццаці не хапае.

— Не выйдзе. Ідзі пазычай.

— У каго я пазычу? Яшчэ стыпендыі не было.

— Нічога не ведаю.

Барыс быў няўмольны і ніякія доказы ў разлік не прымаў.

— Мікалай,— сказаў я свайму сябру,— дай трыццаць капеек.

— Сам рубель аддаў.

— На Алачку?

— Так.

— У каго б узяць?

— Не ведаю.

Я пайшоў на адчайны крок.

— Алачка,— сказаў я,— вы сёння такая прыгожая...

— Ай, кіньце!

— Алачка, ці не знойдзецца ў вас трыццаці капеек?

— Ёсць. А навошта вам?

Сказаць ёй праўду я не мог і, гледзячы ў столь, адказаў:

— Мне патрэбна ўзяць «Беламор» і... дзесяць капеек на дарогу. Нават трыццаць дзве.

— А-а,— расчаравана прамовіла яна.

Калі яна адлічвала мне трыццаць дзве капейкі, я глядзеў на яе і думаў, як ёй будзе прыемна, калі сёння пасля заняткаў яе павіншуюць і паднясуць падарунак, а яна, напэўна, аб гэтым не думае і не здагадваецца. І я ўявіў, як гэта будзе для яе кранаюча і міла.

— Дзякуй, Алачка,— і я хацеў ужо ісці, але яна шэптам сказала:

— Я сёння раздала пятнаццаць рублёў і вось табе трыццаць дзве капейкі. Навошта гэта?

Я засмуціўся:

— Не ведаю, Алачка, наш калектыў такі дружны... нават не ведаю.

Яна паглядзела на мяне ўважліва і яшчэ раз папрасіла нахіліцца да яе:

— Ты сапраўды не ведаеш, што мне сёння падораць? Я туфлі прасіла, але ці набяруць?

**У. ДЗЕЖЫН.**

# НА ЗЛОСЦЬ

ІРЫНКА прыйшла з універсітэта, па-заліхвацку шпурнула партфель у кут і закрычала на ўсю кватэру:

— Матуля, я жанілася!

Маці чымсьці шкварчэла на кухні і на словы Ірынкі не звярнула ніякай увагі. Ірынка прыйшла на кухню і паўтарыла:

— Матуля, я жанілася!

— Вельмі добра,— бясстрасна адгукнулася маці,— мый рукі, зараз вячэраць будзем.

Прыйшоў бацька ў сваім новым паліто і добрым гуморы. Ен нешта напяваў сабе пад нос і вачыма шукаў пантофлі.

— Тата, я жанілася,— сказала яму Ірка.

— Та-ра-ры-ра... Цудоўненька. Дарэчы, ты не бачыла мае пантофлі?

— Вось яны.

— Ага, дзякуй. Тары-ра-ры...

За вячэрай бацька расказаў новае «Знарок не прыдумаеш» — вычытаў у «Крокодиле». Тата наогул любіў чытаць «Крокодил». Усе доўга смяяліся. а пасля Ірка сказала:

— А я жанілася.

Усе засмяяліся яшчэ больш, а бацька сказаў:

— Ну, па-першае, не жанілася, а выйшла замуж. А па-другое, як ідуць твае справы ва універсітэце?

Пасля вячэры ўсе глядзелі кіно, дзе гераіня ніяк не магла выйсці замуж.

— А я ўжо выйшла, — нібы незнарок уставіла Ірка.

Ніхто не звярнуў увагі, толькі матуля, не адрываючыся ад экрана, уздыхнула:

— Бедная жанчына!

Пасля фільма бацькі пілі чай, а Ірка займалася з малодшым братам.

— Значыць так, — чытала яна ўголас умову задачкі,— у магазін прывезлі яблыкі... Слаўка, ты чуеш?

Слаўка не чуў—ён, як зачараваны, пазіраў на сястру.

— Ірка, — шэптам запытаў ён, — а гэта як — замуж?

— Не перашкаджай, слухай далей.

Слаўка не слухаў.

Позна ўвечары патэлефанаваў... Пазваніў Ігар.

— Ну як? — запытаў ён.

— Мне не вераць,— адказала Ірынка.

Трубка ўздыхнула:

— Мае таксама. Памаўчалі.

— Дарэмна толькі заяву пісалі ды штамп у пашпарце ставілі, — зноў уздыхнула трубка.

— Ыгы, — згадзілася Ірка.

— Чуеш, Ірка, а ты мяне кахаеш?

— Ыгы.

— І я цябе — ыгы. Што рабіць будзем?

— Што-што... Разводзіцца. Яны ж не вераць.

Зноў памаўчалі.

— Чуеш, Ірка, справа не ў штампе, калі двое кахаюць адзін аднаго, праўда?

— Не ў штампе.

— Ну і што, ну і развядземся. На злосць усім.

— Ыгы.

— А кахаць усё адно будзем?

— Ыгы.

— На злосць усім.

— Але.

— Ну цалую.

— І я.

— Бывай.

Ірка паклала трубку і сказала гучна:

— Я развялася.

Але ў доме ўсе ўжо спалі...

**А. ДУДЧАНКА.**

# ВЫБІРАЙЦЕ!

**Перш чым выйсці замуж, праверце сябе і свае пачуцці па прапанаванаму тэсту. Дапусцім, у вас у распараджэнні ёсць тры не бог ведае, якія жаніхі. Цалкам добрага чалавека, за якім хоць на край свету, няма. Дэфіцыт. Ды і ці такі ўжо ён добры, калі яго так далёка пасылаюць?**

**Рабіць няма чаго, выбірайце аднаго з трох. Прыводзім знешнія даныя і вытрымкі з біяграфій.**

**Жаніх № 1.** Малады, прыгожы, здаровы. Адукацыя сярэдняя, заробак сярэдні, халасты, навуковых прац не мае, цікавіцца кінападарожжамі, пражывае ў асобнай кватэры, але на першым паверсе. Тэлефон запаралелены з тэлеатэлье.

**Жаніх № 2.** Не такі малады, не такі прыгожы, не такі здаровы. Адукацыя вышэйшая, заробак сярэдні, восьмы год рыхтуецца да абароны, а яе ўсё пераносяць, у мінулым другі разрад па шахматах, зараз — на іншых дзяўчат не глядзіць, ды і вас позіркамі не вельмі песціць. Жыве на 9-м кіламетры. Мае на грашовым утрыманні маці груднога дзіцяці ад першага шлюбу. Раней неаднаразова прыцягваўся да грамадскай работы.

**Жаніх № 3.** Вельмі малады, вельмі непрыгожы, не вельмі здаровы (пляскатая ступня, у дзяцінстве рахіт). Адукацыя незакончаная, сям'я забяспечаная, злоўжывае спіртным, выражаецца культурна толькі пры мужчынах. Смела іграе на гітары і на бягах. Лічыцца сакратаром-машыністкай, бацькам дапамагае траціць усе грошы на сябе і свае патрэбы.

Цяпер, калі ў вас склалася аб жаніхах першае ўражанне, паглядзіце, як яны будуць паводзіць сябе ў некаторых тыповых сітуацыях.

**Сітуацыя № 1. Жаніхі запрасілі вас у кіно.**

**Жаніх № 1** узяць з вас грошы за білет (фільм шырокафарматны, двухсерыйны) катэгарычна адмовіўся, але ў буфет перад пачаткам сеанса не запрасіў.

**Жаніх № 2** ад грошай таксама адмовіўся, сказаўшы, праўда, без ценю ўсмешкі, што лепш у наступны раз вы возьмеце білеты ў тэатр драмы за свае.

**Жаніх № 3** грошы за абодва білеты ўзяў, але тут жа патраціў на піва з марожаным.

**Сітуацыя № 2. Вы папрасілі жаніхоў прыгатаваць што-небудзь паесці.**

**Жаніх № 1** адкрыў банку «Снеданне турыста» і ўскіпяціў чайнік.

**Жаніх № 2** падсмажыў бульбу з маянезам.

**Жаніх № 3** прынёс абед у тэрмасах ад сваёй маці, якая падкаціла да вашага дому на таксі.

**Сітуацыя № 3. Жаніхі падарылі вам на 8 Сакавіка латарэйны білет, які выйграў «Жыгулі».**

**Жаніх № 1** прапанаваў прадаць білет на поўдні і купіць дзве дачы ў сярэдняй паласе (без прапіскі).

**Жаніх № 2** стаў настойваць адразу ж пасля рэгістрацыі шлюбу пайсці ў ДАІ перапісаць машыну на сваё імя.

**Жаніх № 3**—абмыць кожную дэталь «Жыгулей» у «Планеце».

Можна падводзіць вынікі.

Калі вы спынілі свой выбар на жаніху № 1, то пра вас можна сказаць наступнае: вы таварыская, нядрэнная сабой, але мала ведаеце жыццё. Вам неабходна як мага больш чытаць аб'явы аб абмене жылой плошчы.

Калі вам прыйшоўся па душы жаніх № 2, то вы хітрая, вас не ашукаеш, але ваш розум накіраваны не ў той бок. Вас не бянтэжыць рамантыка цяжкіх дарог на работу і плач дзіцяці, не ахопленага яслямі.

Калі вы вырашылі злучыць свой лёс з жаніхом № 3, то вы курыце, любіце апранацца, рабіць педыкюр, цвяроза глядзіце на рэчы бацькоў мужа. Вам патрэбны вытрымкі і ўменне трымаць мужа ў руках, калі ён не можа стаяць на нагах.

Калі вы нікога не выбралі, гэта ўжо занадта. Не трэба сябе пераацэньваць. Лепш усё ж прыняць прапанову жаніха № 2. Пакуль не позна.

**А. РАС.**






Няма слоў...



Атлант і карыятыды...

# ЖЫЦЦЁ З УСМЕШКАЙ

МІХАСЬ разыграў Машу: дзеля жарту падкінуў ёй жабку ў партфель.

Тады Маша дзеля смеху падклала яму кнопку на парту.

Міхась не застаўся ў даўгу — каб усіх насмяшыць, на лабараторных занятках стукнуў Машу токам.

А яна яму хлапушкай пад самым вухам стрэльнула.

А ён — ацэтонам на сукенку пырснуў.

А яна зламала яму палец мышалоўкай.

Тады Міхась узяў і разыграў Машу так, што ў яе дыпломе апынулася лішняя чацвёрка.

Тады Маша ўзяла і скампраметавала яго перад бацькамі нявесты.

А ён змяніў голас на жаночы і пазваніў яе раўніваму мужу.

А Маша змяніла почырк на мужчынскі і падкінула Міхасю ананімку аб яго старэйшым сыне.

А ён дзеля жарту запусціў у яе кватэру паўсотні белых мышэй.

А яна дзеля смеху расклеіла па ўсяму гораду аб'явы, што ў яго прадаецца славянская шафа.

Тады Міхаіл Іванавіч прыдумаў такі розыгрыш, што з Марыяй Іванаўнай здарыўся мікраінфаркт.

І вось тут ён адчуў сябе вінаватым і зайшоў да яе прасіць прабачэння.

— Ну што ты!—здзівілася Марыя Іванаўна. — Якія непаразуменні могуць быць між старымі сябрамі!

І непрыкметна апусціла Міхаілу Іванавічу ў кішэню жабку...

**В. ГУРЭЕЎ.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

АТ 10110 Зак. 417

8 сакавіка 1984 г.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ